# РАЗВИТИЕ ОБРАЗОВАНИЯ, НАУКИ И КУЛЬТУРЫ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ



С.У. КУХТА

## *ВЫКЛАДАННЕ РОДНАЙ МОВЫ Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ ЭКАНАМІСТАЎ У ВНУ*

Кожнаму з нас вядома, што адукацыя функцыянус не толькі як працэс перадачы ведаў і ўменняў, але і як шлях развіцця інтэлекту і асабістых якасцей чалавека. Таму арыентацыя на засваенне сумы ведаў недастатковая: важна сфарміраваць асобу, навучыць уменню арыентавацца ў сучасным патоку інфармацыі, разбірацца ў яе сутнасці, выхоўваць імкненне да самаадукацыі, да самастойнага авалодання ведамі. У гэтай сувязі асаблівую актуальнасць набывае праблема прафесійнай накіраванасці навучання. У яе вырашэнні вялікім патэнцыялам валодае родная мова як універсальны сродак, з дапамогай якога забяспечваецца працэс навучання і выхавання ў вну.

Новая стратэгія рэфармавання вышэйшай школы патрабуе ўсебаковага, цэласнага вызначэння мэты і задачы курса роднай мовы ў вну. На першы план выступае не граматыка-арфаграфічны накірунак, а моўная асоба і, у прыватнасці, развіццё маўленчай сферы, фарміраванне прафесійных камунікатыўна-маўленчых уменняў і асабістых якасцей студэнта сродкамі роднага слова.

Стратэгічная мэта ўсяго навучальнага працэсу будучых эканамістаў бачыцца ў гуманістычнай накіраванасці, творчым развіцці асобы і фарміраванні яго прафесійнай культуры. Таму мэтазгодна наладзіць навучальны працэс так, каб будучы эканаміст добра засвоіў не толькі асноўныя моўныя паняцці, але і навучыўся ўмела карыстацца мовай, авалодаў тымі прыёмамі, якія неабходны, каб хутчэй і якасна засвойваць інфармацыю з разнастайных крыніц, здолеў уздзейнічаць словам на розум і пачуцці сваіх суразмоўцаў. А гэта магчыма тады, калі студэнты будуць вывучаць мову не толькі як сукупнасць кампанентаў, што ўтвараюць яе сістэму законаў, якія рэгулююць іх узаемадзеянне і скрытыя ў сваім механізме сістэмы, а як камунікатыўную з'яву, дыялектычнае адзінства матэрыяльнай структуры і грамадскага функцыянавання.

Аналіз сучаснай практыкі дае выснову сцвярджаць, што існуючая сістэма падрыхтоўкі будучых спецыялістаў накіравана на фарміраванне шэрагу прафесійных маўленчых уменняў і асабістых якасцей эканаміста. У гэтай сувязі мэтай курса роднай мовы з'яўляецца фарміраванне высокаадукаванай моўнай асобы: важна дапамагаць студэнтам асэнсаваць і ўспрымаць не толькі граматычную сістэму мовы, але і яе дзейнасны аспект; навучыць разумець сутнасць мовы; сфарміраваць прафесійныя камунікатыўна-маўленчыя ўменні для развіцця з разнастайных бакоў асобы эканаміста, для свабоднага і творчага карыстання мовай ва ўсіх сферай дзейнасці. Інакш кажучы, няспынна патрэбна ўдасканальваць моўную, лінгвістычную, камунікатыўную, моўна-эстэтычную кампетэнцыю студэнтаў.

Зыходзячы з мэт курса роднай мовы, бачыцца мэтазгодным ажыццяўляць рэалізацыю канкрэтных задач. Сярод іх найбольш важнае значэнне набываюць наступныя:

---

*Святлана Уладзіміраўна КУХТА, выкладчыца кафедры рускай і беларускай моў БДЭУ.*

а) рацыянальна арганізоўваць выкладанне лінгвістычнага матэрыялу з улікам прафесійных камунікатыўна-маўленчых уменняў для іх далейшай рэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці;

б) мець навуковыя веды пра законы і з'явы сучаснай беларускай мовы, яе лексічны склад, фанетычную сістэму і граматычны лад, дапамагаць будучаму эканамісту практычна авалодаць літаратурнымі нормамі і павысіць культуру іх маўлення, выпрацаваць навыкі самастойнага аналізу моўных фактараў;

в) прылучаць студэнтаў да актыўнага валодання прафесійнай тэрміналогіяй;

г) удасканальваць маўленчую практыку студэнтаў для свабоднага валодання вуснай і пісьмовай роднай мовай;

д) засвойваць этычныя нормы маўлення, выхоўваць культуру суразмоўніцтва, а гэта азначае, што трэба удасканальваць моўную культуру як паказчык прафесійнай кваліфікацыі;

е) фарміраваць правільнае ўяўленне аб значэнні роднай мовы ў жыцці грамадства, беларускай нацыі, у станаўленні асобы чалавека;

ж) раскрываць духоўную сутнасць мовы, арыентаваную на развіццё і самарэалізацыю асобы.

Ні адна з пералічаных задач сама па сабе не з'яўляецца вызначальнай. Усе яны ўзаемазвязаныя, узаемазалежныя, узаемаабумоўленыя і ў адзінстве раскрываюць працэс дасягнення мэты курса роднай мовы.

Такім чынам, асэнсоўваючы стратэгічныя арыенціры выкладання роднай мовы ў сістэме падрыхтоўкі эканамістаў у вну, сутнасць прафесійнай накіраванасці разумеецца не толькі ў вывучэнні праграмных пытанняў тэарэтычнага курса, але і ў набыцці прафесіных моўных і маўленчых уменняў і навыкаў, ва ўменні карыстацца беларускім словам для развіцця інтэлектуальных магчымасцей, ва ўзбагачэнні прафесійнага ўзроўню студэнтаў-эканамістаў.

*К СВЕДЕНИЮ АВТОРОВ!*

*Статьи для публикации в журнале принимаются вместе с выпиской из протокола заседания кафедры, включающей рекомендацию об опубликовании. Авторам, не работающим в БГЭУ, необходимо приложить рекомендательное письмо руководства. Ответственность за приводимые в материалах факты несут авторы.*

*Редакция может публиковать статьи в порядке обсуждения, не разделяя точку зрения автора.*

*Объем статьи не должен превышать 10-ти машинописных страниц. Материалы принимаются выполненными на компьютере (прилагается дискета) в текстовом редакторе MicrosoftWORD шрифтом размером 14 пунктов через 2 интервала.*